Казка за казкай

Медуза і малпа

Японскія казкі

Казка за казкай



Медуза і малпа

Японскія казкі

МІНСК «ЮНАЦТВА» 1988

ББК84 Я5
М 42

Серыя заснавана ў 1981 годзе

Укладальнік С. А. МІХАЛЬЧУК

Мастак Н. М. ПАПЛАЎСКАЯ

В книгу включены остроумные, занимательные японские народные сказки «Медуза и обезьяна», «Одноглазый и двуглазый», «Жадная хозяйка» и другие.

4803000000 — 073
М ——————— 34—88
М 307(03)—88

ISBN 5—7880—0033—5

© Выдавецтва «Юнацтва», 1988.

МЕДУЗА І МАЛПА

На дне мора здарылася бяда — у марскога дракона захварэла дачка. Дракон быў дужэйшы за ўсіх у моры: страшэнны даўжэзны хвост кольцамі, з пашчы шугае агонь. Усе яго баяліся: і акулы, і рыбы, і медузы.

І вось у дракона захварэла дачка. Сабраў ён у сябе ў палацы самых лепшых лекараў. Лячылі яны драконаву дачку і так і гэтак, паілі яе ўсякімі лекамі,— нічога не памагала. Дачка ўсё худзела і сінела.

Тады дракон паклікаў падданых і спытаў:

— Што мне рабіць?

— Са! — толькі і адказалі рыбы і схілілі галовы набок. А калі ў Японіі кажуць «са», гэта азначае: сказаць няма чаго.

Тады паслалі па каракаціцу. Каракаціца паплавала-паплавала вакол хворай і сказала:

— Трэба дастаць печань жывой малпы.

Дракон раззлаваўся:

— Каб расстарацца печань жывой малпы, трэба спачатку дастаць жывую малпу! А дзе яе знойдзеш тут, на дне мора?

— Не злуйся! — сказала каракаціца. Яна была вельмі старая і ўсё ведала.— Далёка на поўдні ёсць у моры Малпін востраў. Пашлі туды каго-небудзь, і табе прывязуць жывую малпу.

З такім важным даручэннем не пашлеш абы-каго. Пачалі думаць, каго ж паслаць. Дракон кажа:

— Пашлём акулу. Яна зубастая.

Каракаціца замахала ўсімі сваімі васьмю нагамі:

— Не! Не! Хіба можна пасылаць акулу? Рап-

там яна праглыне малпу разам з печанню!

— Ну, тады пашлём рыбу-пілу. Яна шустрая.

— Не! — зноў сказала каракаціца.— А раптам рыба-піла па дарозе перапілуе малпу папалам?

— Дык каго ж тады паслаць?

— Вось што! — сказала каракаціца. Яна была старая і ўсё ведала.— Пашлі медузу. Усім вядома, што малпа жыве на сушы. Значыцца, каб дастаць яе, трэба вылазіць з вады. А гэта можа толькі медуза. Медуза выхваляецца, што ў яе чатыры нагі і ёй усё адно — плаваць ці хадзіць па зямлі. Няхай жа дастане малпу.

А трэба сказаць, што ў тыя далёкія часы медуза была зусім не такая, як сёння. Мела яна і косці, і дужыя лапы і магла не толькі плаваць, але і па зямлі поўзаць, як чарапаха.

— Чуеш, медуза? — спытаў дракон.

— Чую,— сказала медуза.— Толькі мне ніколі дагэтуль не даводзілася даставаць малпаў. Малпа — якая яна з выгляду?

— У малпы чырвоны твар і кароткі хвост. Яна любіць лазіць па дрэвах і есці каштаны.

— А-а,— сказала медуза. Яна хацела ўжо рушыць у дарогу, але задумалася і зноў спыталася: — А як дастаць малпу?

— Вядома, табе сілком малпу не ўзяць. Ты маленькая, а яна вялікая. Трэба яе ашукаць.

— А-а,— другі раз сказала медуза і падалася ўжо ў дарогу, але зноў спынілася і спытала: — Як жа я на сабе яе давязу, калі я маленькая, а яна вялікая? Мне будзе цяжка.

— Нічога не зробіш! Давядзецца пацярпець.

— А-а,— трэці раз сказала медуза, усплыла з дна мора наверх і паплыла па хвалях далёка-далёка на поўдзень.

Усю дарогу медуза думала. Яна думала пра тое, як бы ёй ашукаць малпу, і дарога здалася ёй кароткай. А плыла яна ажно цэлыя тры дні.

Нарэшце далёка-далёка наперадзе на блакітнай вадзе паказалася чорная кропка.

«Вось і Малпін востраў!» — падумала медуза.

Яна паплыла хутчэй, дабралася да берага, сцепанулася і вылезла на сушу. І адразу ж убачыла дрэва, а на дрэве жывёліну з чырвоным тварам і кароткім хвастом.

«Вось яна, жывая малпа!»

— Дзень добры, малпа! — загаварыла медуза.— Якое цудоўнае надвор'е!

— Добры дзень, не ведаю, як цябе завуць. Надвор'е цудоўнае, гэта праўда, а хто ты такая і адкуль узялася?

— Я — медуза. Жыву на дне мора. Мне захацелася пагрэцца на сонейку, і я ўсплыла наверх пагуляць. Выпадкова заплыла сюды і вылезла на бераг. У мяне, бачыш, чатыры нагі. Мне ўсё адно, што па вадзе плаваць, што па сушы хадзіць. А слаўны ў вас астравок!

— Самы лепшы востраў на свеце,— сказала малпа.— Паглядзі, якія ў нас высозныя дрэвы, колькі навокал арэхаў і каштанаў. Табе, мусіць, ніколі яшчэ не даводзілася бываць у такім цудоўным месцы.

— Ну, гэта як сказаць! — адказала медуза.— Я пахваліла твой астравок, бо я ветлівая. Але ты сама павінна разумець, што мне даводзілася бачыць на свеце мясціны куды лепшыя. Я ж жыву на дне мора!

— Няўжо? — здзівілася малпа і перабралася



на ніжэйшую галіну: адсюль ёй было лепей чуваць.— А хіба там можна жыць?

— Ды ты што, няўжо не ведаеш? Няўжо не чула пра палац марскога дракона? Я жыву каля самага палаца.

— Чуць-то я чула, а бачыць не давялося,— прызналася малпа.— Хіба толькі на малюнках...

— Ну, наша дно куды прыгажэйшае, чым на малюнках! — перабіла медуза.— Ты нават не можаш сабе ўявіць, як там добра!

— А што там добрае? — спытала малпа.

Медуза хацела была сказаць, што там густая салёная вада і многа-многа ціны і смаўжоў. Бо

для яе гэта самае смачнае. Але яна своечасова ўспомніла, што ёй загадалі ашукаць малпу, і сказала:

— Там вельмі высозныя дрэвы, у два разы вышэйшыя, чым у вас.

— А ці ёсць на іх каштаны? — спытала малпа і перабралася на самую ніжнюю галіну.

— Каштаны? Ды колькі хочаш! Яны растуць у нас на ўсіх дрэвах. Не толькі на каштанах, а нават і на соснах.

— Ого! — здзівілася малпа. Яна зусім злезла з дрэва і падышла да самай вады.— Як мне хочацца пабываць у вас.

Медуза зарадавалася, але прыкінулася, нібыта ёй усё роўна.

— Калі табе надта ўжо хочацца пабываць у нас, я магу паказаць табе дарогу,— сказала яна.

— Але ж я не ўмею хадзіць па вадзе.

— Не ўмееш? Шкада. Ну, калі табе вельмі хочацца, дык хай будзе так: я павязу цябе на сваёй спіне.

— Не-не, як гэта можна! Табе будзе цяжка.

— Не турбуйся, я пацярплю.

— Ну, калі ты такая ласкавая, дзякуй! Давай паедзем.

Медуза плюхнулася ў ваду, а цікаўная малпа асцярожна ступіла на яе шырокую спіну, села на кукішкі і доўгімі рукамі ўхапілася за бакі медузы.

— Толькі паціхеньку,— сказала яна.— Баюся, каб хоць не зваліцца ў ваду: спіна і бакі ў цябе такія слізкія!

— Нічога, трымайся мацней!

Медуза паплыла хутка-хутка. Галоўнае было зроблена: жывая малпа сядзела ў яе на спіне. Цяпер медузе больш не было аб чым думаць. Ёй нават зрабілася сумна. Да таго ж яна была балбатуха і не любіла маўчаць, калі ёсць з кім пагаманіць.

— Скажы, калі ласка,— спытала раптам медуза,— у цябе ёсць печань?

Малпа здзівілася:

— А навошта табе гэта ведаць?

— О, гэта вельмі важна!

— Для каго важна?

— Ды так. Не магу сказаць.

Малпа спалохалася. Яна адразу сцяміла, што супраць яе штосьці задумалі.

— Не, калі ласка, скажы мне,— папрасіла яна медузу.— А то раптам высветліцца, што печань у мяне зусім не такая, як табе трэба.

Тут ужо і медуза спалохалася. Яна забыла пра ўсё, чаму яе навучалі, і расказала малпе ўсю праўду:

— Твая печань патрэбна для дачкі марскога дракона. Яна захварэла, і яе ніяк не могуць вылечыць. Вось мяне і паслалі па цябе. Калі я цябе прывязу, у цябе возьмуць печань, драконава дачка яе з'есць і будзе здаровая.

Малпа ажно закалацілася ад страху. Нават траха не саскочыла са спіны медузы. Але навокал было мора. Што ёй заставалася рабіць? Папрасіць, каб медуза адвезла яе назад? Але ж медуза яе не паслухаецца.

Малпа падумала крышку і сказала самым спакойным голасам:

— Вядома, я з прыемнасцю аддам сваю печань. У мяне іх многа. Хіба ж я пашкадую адну або дзве пячонкі, ды яшчэ для каго? Для дачкі

самога марскога дракона! Не такая я малпа, каб шкадаваць. Але чаму ж ты не сказала мне гэта адразу? Я ж, нібы знарок, пакінула ўсе свае печані дома.

— Як гэта — пакінула?

— Ды так і пакінула! Раніцай я іх памыла і павесіла на дрэва сушыць. Іх трэба раз у тыдзень мыць, а то яны робяцца брудныя.

«От няшчасце! — падумала медуза.— Добра яшчэ, што я своечасова спытала».

— Гэй, ты! — сказала яна малпе.— Дзеля чаго я цябе дарэмна вязу? Навошта ты мне без печані?

— І праўда,— адказала малпа.— Давай вернемся на востраў па печань.



— А ты праўду кажаш? Яны і на самай справе вісяць там на дрэве?

— Вось пабачыш! У мяне там ёсць адна вельмі добрая, тлустая пячонка.

— Дык ты яе і вазьмі, самую тлустую. Добра?

— Абавязкова. Толькі хутчэй давязі мяне да берага!

Медуза павярнулася і паплыла назад да вострава.

Як толькі яна апынулася каля берага, малпа саскочыла з яе спіны, спрытна залезла на дрэва і ўхапілася за адну з галін рукамі і нагамі.

— Чаго ты там гэтак доўга важдаешся? — паклікала яе медуза.— Хутчэй! Мы і так страцілі шмат часу.

А малпа ўскарабкалася на самую верхавінку дрэва і паказала медузе язык.

— Грубіянка! — раззлавалася медуза.— Злазь хутчэй!

— І не падумаю! Дзякуй за пагулянку. Больш я нікуды не паеду.

— А печань? Як жа я без яе застануся? — заплакала медуза.

— Як ты без яе застанешся, мне ўсё роўна. А вось я без яе не хачу заставацца. Ты што ж думаеш, мае печані і сапраўды вісяць на дрэве? Не, у мяне ўсяго адна печань і тая ў мяне ўнутры, дзе ёй і належыць быць.

— Дык ты, значыцца, мяне ашукала? — разлавалася медуза.— Гэта ж несумленна! Я на цябе паскарджуся марскому дракону.

— Не баюся я твайго марскога дракона. А калі табе ўжо гэтак хочацца займець маю печань, лезь да мяне на дрэва сама. У цябе ж чатыры нагі.

Але лазіць па дрэвах медуза не ўмела.

— Паслухай,— сказала яна тады,— а як жа палац марскога дракона? Ты ж збіралася на яго паглядзець. А каштаны на соснах?

— Не патрэбны мне твае каштаны на соснах. Я люблю толькі каштаны з каштанаў,— адказала малпа.

Так і давялося дурной медузе вяртацца ні з чым. Яна зноў паплыла па хвалях далёка-далёка на поўнач, дадому. І зноў дарога здалася ёй кароткай: яна ўвесь час думала. Думала цяпер яна пра тое, чаму гэта малпа больш не хоча паглядзець на падводнае царства.

А дома яе ўжо тры дні чакаў дракон і ўсе яго падданыя.

— Дзе ж малпа? — закрычалі рыбы, як толькі ўбачылі медузу.

— На дрэве,— сумна адказала медуза.— Спачатку я ашукала яе, а потым яна мяне. Я ёй расказала, што ў нас на соснах растуць каштаны. Малпе гэта спадабалася. Яна села мне на спіну,

і я павезла яе. Але потым па дарозе малпа ўспомніла, што пакінула сваю печань дома, і нам прыйшлося вярнуцца на востраў. А на самай справе малпа мяне ашукала: печань была ў яе з сабою. Ёй проста не захацелася ехаць да нас у падводнае царства. Яна думае, што каштаны на соснах не салодкія.

Марскі дракон паслухаў-паслухаў медузу, потым пляснуў хвастом па дне і закрычаў:

— Біць яе з усяе сілы! Так біць, каб усе косці з яе выбіць! Такая дурніца і без касцей пражыве.

Білі медузу, білі, білі яе, білі — і сапраўды ўсе косці з яе выбілі.

З таго часу медуза і засталася без касцей. І гушкаецца яна на хвалях, як мяккі зыбкі камяк.

Навошта дурному косці?



АДНАВОКІ І ДВУХВОКІ

Жыў на адным востраве гультай. Звалі яго Сэкі. Ад ранку да вечара валяўся ён на падранай цыноўцы і штосьці мармытаў.

— Што ты ўсё мармычаш, Сэкі? — сарамацілі яго людзі.— Узяўся б ты лепш за работу.

Сэкі адказваў:

— Цэлыя дні я чытаю малітву, прашу багоў збавіць мяне ад беднасці. Калі багі пачуюць мае просьбы, яны адразу ж пашлюць мне шчасце!..

І вось аднойчы Сэкі даведаўся, што на суседнім востраве жывуць аднавокія людзі.

Зарадаваўся гультай:

— Багі пачулі мае малітвы! Яны паслалі мне шчасце! Зараз жа паплыву на востраў аднавокіх, заваблю якога-небудзь аднавокага вырадка ў сваю лодку і прывязу сюды!

Дзівяцца суседзі:

— Навошта табе патрэбны гэты чалавек?

— А я пасаджу яго ў клетку і буду паказваць за грошы. Кожны захоча паглядзець на такога вырадка.

Сеў гультай у лодку і паплыў на суседні востраў.

Як толькі Сэкі прычаліў да берага, ён адразу ж убачыў тое, што шукаў: насустрач яму ішоў аднавокі чалавек.

«О шчасце, маё багацце само ідзе да мяне!» — зарадаваўся Сэкі.

Хітры гультай нізка пакланіўся аднавокаму і сказаў з няшчырай усмешкай:

— Шмат гадоў марыў я сустрэцца з такім прыемным чалавекам, як вы...

Аднавокі пільна паглядзеў сваім адзіным во-



кам на Сэкі і пачціва прамовіў:

— Я таксама марыў усё жыццё сустрэцца з такім прыемным чалавекам, як вы.

Тады каварны гультай сказаў:

— Вельмі прашу вас наведаць мой дом. Сядзем хутчэй у лодку і паплывём да мяне.

Аднавокі адказаў:

— З падзякай прымаю ваша ласкавае запрашэнне. Але спачатку прашу і малю вас, зрабіце гонар майму дому. Мае сваякі будуць у захапленні ад знаёмства з вамі.

— З радасцю пераступлю парог вашага дома,— сказаў Сэкі, а сам падумаў: «Заўтра ты бу-

дзеш сядзець у клетцы, і да мяне з усіх бакоў пасыплюцца сярэбраныя манеты».

Ледзь толькі Сэкі зайшоў у дом аднавокага, як яго акружылі браты гаспадара і наперабой закрычалі:

— Глядзіце, у яго два вокі! Ну і выродак! Вось дык пачвара! Адкуль ён узяўся?

— Зараз скажу, толькі звяжыце яго мацней,— загадаў гаспадар дома.

Сэкі не паспеў і міргнуць, як тут жа быў звязаны.

Тады аднавокі сказаў братам:

— Радуйцеся! Нашай галечы прыйшоў канец. Мы пасадзім гэтую пачвару ў клетку і будзем паказваць за грошы. Кожны на нашым востраве захоча паглядзець на двухвокага чалавека!

Гадзіны не мінула, а Сэкі ўжо сядзеў у клетцы. Адусюль спяшаліся жыхары вострава аднавокіх, каб паглядзець на чалавека з двума вокамі. І кожны плаціў гаспадару клеткі сярэбраную манету.

Так закончыў свае дні гультай Сэкі.

ГУЗ СПРАВА І ГУЗ ЗЛЕВА

Даўным-даўно жыў у вёсцы Асана стары дзед. Звалі яго Гаэмон. Гэта быў незвычайны стары: на правай шчацэ ў яго тырчаў гуз. Вялікі круглы гуз, падобны на добры яблык. Калі Гаэмон глядзеў налева, ён усё бачыў. А калі пазіраў направа, дык

бачыў толькі свой гуз. Гэта яму вельмі не падабалася. А ў дадатак да ўсяго ад цяжкага гуза галава ў яго хілілася набок. Гэта таксама было нязручна.

Стары толькі і думаў, каб як-небудзь збавіцца ад гуза.

Вось пайшоў ён аднойчы ў лес на гару насячы сабе дроў. Раптам усчалася навальніца. Бліснула маланка, загрымеў гром, паліў дождж.

«Куды б гэта мне схавацца?» — падумаў стары і пачаў азірацца па баках. Непадалёку ён убачыў вялікае дуплаватае дрэва. Зарадаваўся стары, падбег да дрэва і залез у дупло.

А ўжо сцямнела. У гарах больш не стукалі сякеры дрывасекаў. Было зусім ціха. Толькі вецер з выццём праносіўся паўз дрэвы. Гаэмону зрабілася боязна. Ён скурчыўся ад страху на самым дне дупла, моцна зажмурыўся і пачаў мармытаць сам сабе: «Кувабара, кувабара»[1].

Апоўначы, калі вецер сціх і кроплі дажджу падалі ўсё радзей і радзей, з гары пачуўся нейкі шум, моцны тупат і галасы.

Сядзець у дупле старому было вельмі сумна, і ён дужа ўзрадаваўся галасам. Расплюшчыў во-

---

[1] Цур, мяне!

чы, падняўся на ўвесь рост і асцярожна высунуў галаву з дупла.

Што ж ён убачыў?

З гары да дрэва ішлі не людзі, а горныя страшыдлы. Чырвоныя, сінія, зялёныя. У каго былі тры вокі, у каго два насы, у каго рог на лбе, у каго рот да вушэй. А толькі такога гуза, як у Гаэмона, не мела ніводнае страшыдла.

Гаэмон яшчэ больш спужаўся. Ён прысеў у дупле і гэтак скурчыўся, што зрабіўся траха не меншы за свой гуз.

Тым часам страшыдлы з выццём і рыкам падышлі да самага дрэва і пачалі садзіцца на траве. Галоўнае страшыдла села пасярэдзіне, а па баках паўкругам паселі меншыя...

Раптам адно маленькае страшыдла падхапілася, выбегла на сярэдзіну круга і пайшло ў скокі. За ім прыпусцілі і астатнія. Адны скакалі лепей, другія крыху горш. Калі скокі скончыліся, галоўнае страшыдла з ухвалою кіўнула галавой і сказала:

— Добра, вельмі добра! У нас сёння весела. Ды толькі вы скачаце аднолькава. От каб хто-небудзь паскакаў інакш, па-новаму!

Стары ўсё гэта чуў. Ён спачатку сядзеў у дупле і баяўся расплюшчыць вочы. Але потым яго пачала браць цікаўнасць. Ён асцярожна прыўзняўся і трошачкі высунуў галаву з дупла, так,

што толькі яго левае вока было над дуплом, а правае вока, нос і гуз заставаліся ў дупле. А калі Гаэмон убачыў, як весела страшыдлы скачуць, ён зусім забыўся на страх. Ногі ў яго самі так і задрыгалі. Але ў дупле было цесна, там не тое што скакаць, а і павярнуцца было нельга.

І раптам Гаэмон пачуў, як галоўнае страшыдла прамовіла: «От каб хто-небудзь паскакаў інакш, па-новаму!» Тут старому страшэнна захацелася выскачыць з дупла і паскакаць на волі. Не, боязна! А раптам з'ядуць?

Пакуль ён гэтак разважаў, страшыдлы ўзялі-ся ўсе разам пляскаць у ладкі, ды так дружна і весела, што Гаэмон не мог больш трываць.

— Эх, чаго баяцца! Паскачу апошні раз, а там хай сабе хоць і з'ядуць!

Ён абапёрся рукою на край дупла, перакінуў нагу і выскачыў якраз на сярэдзіну круга.

Страшыдлы ажно спалохаліся. Паўсхоплівалі-ліся з месцаў, перапужаліся:

— Што такое?

— Што здарылася?

— Чалавек!

А стары, нікога і нічога не слухаючы, кінуўся ў скокі. То падскочыць, то прыгнецца, то прысядзе, то выпрастаецца, то направа забяжыць, то налева адыдзецца, то нібы ваўчок закруціцца. Скача і пакрэхтвае:

— Э-э, кара, э, кара...

Страшыдлы загледзеліся на яго, пачалі прытупваць нагамі, прыцмокваць языком, пляскаць у ладкі.

— Здорава!

— Хвацка!

Калі Гаэмон нарэшце выбіўся з сілы і спыніўся, галоўнае страшыдла сказала:

— Ото дзякуй, стары! Мы самі любім паскакаць, а такіх скокаў яшчэ ніколі не бачылі. Прыходзь заўтра ўвечары, паскачы нам яшчэ раз.

Гаэмон толькі ўсміхнуўся:

— Добра! Я і без вашага запрашэння прыйду. Сёння, шчыра кажучы, я не збіраўся скакаць, не падрыхтаваўся. А ўжо назаўтра я ўспомню ўсё, што скакаў, як быў малады.

Тут адно страшыдла, яно сядзела справа ад галоўнага, сказала:

— А можа, стары надумаўся нас ашукаць і не прыйдзе? Трэба ўзяць у яго што-небудзь у заклад.

Галоўнае страшыдла кіўнула галавою:

— І праўда, трэба.

— Але што ж у яго ўзяць?

Страшыдлы зашумелі. Адны крычалі: «Капялюш!», а другія: «Сякеру!»

Але галоўнае страшыдла падняло руку і, калі ўсе сціхлі, сказала:

— Лепш за ўсё ўзяць у яго гуз са шчакі. Я не раз бачыў людзей і ведаю, што такога гуза ні ў кога няма. Мабыць, гэта вельмі каштоўная рэч.

У Гаэмона ад радасці ажно рукі і ногі задрыжалі. Але ён прыкінуўся, нібыта яму вельмі шкада свайго гуза.

— Лепей вырвіце ў мяне вока,— закрычаў ён,— лепей адрэжце язык, адарвіце нос, вушы, але толькі, калі ласка, не чапайце гуза! Я столькі гадоў нашу яго, я так шаную яго. Што буду я рабіць без гуза?

Галоўнае страшыдла пачула гэта і сказала:

— Бачыце, як ён даражыць сваім гузам! Ну, калі так, вазьміце яго!

Тут жа самае маленькае страшыдла падскочыла да старога і як згледзець вокам адкруціла гуз з яго шчакі. Гаэмону нават не забалела.

Тым часам пачало днець. Закаркалі вароны. Страшыдлы замітусіліся.

— Ну, стары, прыходзь заўтра! Атрымаеш назад гуз.

І раптам усе зніклі.

Гаэмон азірнуўся па баках — нідзе нікога няма. Дакрануўся да шчакі — гладка. Скасавурыў вочы направа — і сасну відаць, і галіны, а гуза не відаць.

Няма больш гуза!

— Ото шчасце! Ну і цуды бываюць на свеце!

І стары пабег дадому, каб хутчэй парадаваць сваю старую.

Калі старая ўбачыла яго без гуза, яна ажно рукамі пляснула:

— Куды ж ты падзеў свой гуз?

— У мяне яго чэрці забралі.

— Ну і ну! — толькі і сказала старая, і вочы ў яе зрабіліся круглыя.

А ў той самай вёсцы жыў другі стары. Звалі яго Буэмон. Ён так быў падобны на Гаэмона, як быццам адзін з іх быў сапраўдны, а другі з люстэрка. У Буэмона таксама быў на шчацэ вялізны гуз, толькі не на правай, а на левай.

Таму, калі ён глядзеў направа, дык бачыў усё, што хацеў бачыць, а калі глядзеў налева, дык бачыў не тое, што хацеў, а толькі свой гуз.

І галава яго таксама хілілася, толькі не направа, а налева.

Гуз Буэмону даўно абрыдзеў. Яму вельмі хацелася, каб у яго не было гуза.

Вось ідзе ён па вёсцы і сустракае свайго сусе-

да, Гаэмона. Глядзіць, а ў Гаэмона правая шчака такая ж гладкая, як і левая. Нібыта і не было ў яго гуза.

— Паслухай,— спытаў ён,— а куды падзеўся твой гуз? Можа, яго зрэзаў які-небудзь умелы лекар? Скажы мне, калі ласка, дзе ён жыве, і я зараз жа пайду да яго. Няхай ён зрэжа і мой гуз.

А Гаэмон адказвае:

— Не, гэта не лекар зняў мой гуз.

— Не лекар? А хто ж?

Тут Гаэмон расказаў Буэмону ўсё, што з ім здарылася ў мінулую ноч.

— Вунь яно што! — сказаў Буэмон.— Ну, скакаць і я ўмею! Сёння ж пайду да чарцей і паскачу. Скажы толькі, дзе гэтае месца, куды яны прыходзяць уночы.

Гаэмон расказаў падрабязна, як знайсці дрэва з дуплом, у якім ён праседзеў ноч.

Буэмон, вядома, зарадаваўся і зараз жа пабег у лес, знайшоў дрэва, залез у дупло і пачаў чакаць страшыдлаў.

Роўна апоўначы зверху, з гары, пачуўся шум, моцны тупат і галасы. Да дрэва з выццём і рыкам беглі чырвоныя, сінія, зялёныя страшыдлы. Як і ўчора, яны паселі на траве перад дрэвам...

А стары, як толькі ўбачыў страшыдлаў, зашыўся ў дупло і зажмурыў вочы. Ад страху нават забыўся, чаго ён прыйшоў.

І раптам ён пачуў, як галоўнае страшыдла зараўло:

— Ну што, няма яшчэ старога?

Тут Буэмон успомніў пра свой гуз і падумаў: «Ну, калі ўжо прыйшоў, трэба вылазіць. Што будзе, тое і будзе, паскачу ім!»

І ён сяк-так выкараскаўся з дупла.

Самае маленькае страшыдла ўбачыла яго і запішчала на ўсю моц:

— Прыйшоў! Прыйшоў! Вось ён!

Галоўнае страшыдла зарадавалася:

— А, прыйшоў? Ну, малайчына стары! Хадзі сюды, паскачы.

Страшыдлы заплясскалі ў ладкі. А стары ад страху ледзь жывы: падняў ён правую на-



гу — левая падагнулася, траха не паваліўся. Падняў левую — правая падагнулася, зноў ледзь не расцягнуўся.

Галоўнае страшыдла глядзела-глядзела і раптам раззлавалася:

— Гэта што за скокі! Ты сёння так кепска скачаш, што глядзець брыдка. Досыць! Прэч адсюль! Гэй, аддайце яму заклад!

Адразу ж самае маленькае страшыдла пабегла да старога.

— На, забірай назад!

І — плясь! — прыляпіла яму гуз на правую шчаку.

Цяпер у старога два гузы: справа гуз і злева гуз.

Затое хоць галава не хіліцца ні направа, ні налева, а трымаецца прама.

ПРАГНАЯ ГАСПАДЫНЯ

У адну вясковую гасцініцу зайшоў вандроўны гандляр. За плячамі ён нёс вялізны клунак з таварамі. А гаспадыня гасцініцы была прагная жанчына. Як толькі яна ўбачыла клунак, ёй захацелася яго займець. Яна завяла гандляра ў пакой, а сама

пабегла да мужа, каб параіцца, як выдурыць у гандляра клунак.

— Гэта вельмі лёгка зрабіць,— сказаў ёй муж.— Трэба нарваць травы мёга, зварыць яе і падмяшаць у вячэру. Трава мёга адбірае памяць. Калі гандляр паесць яе, ён абавязкова забудзе свой клунак у нас.

Гаспадыня так і зрабіла: пайшла ў сад, нарвала цэлае бярэма травы мёга, зварыла яе і адвар падмяшала ва ўсе стравы, нават у рыс. А потым падала ўсё гэта на вячэру гандляру.

Гандляр з'еў вячэру і нічога не заўважыў.

Толькі ў галаве ў яго крыху закружылася і твар пачырванеў; яму захацелася спаць. Ён пайшоў да сябе ў пакой, лёг і адразу заснуў. Назаўтра ён прачнуўся яшчэ на досвітку з цяжкай галавою, сабраўся і пайшоў сабе далей.

Гаспадыня пачакала, пакуль гандляр выйдзе з гасцініцы, і тут жа кінулася ў яго пакой па клунак. Але пакой быў пусты. Гаспадыня ўсё агледзела, усё абшнарыла. Клунак не іголка, прыкмеціць яго няцяжка. Ды як ні шукала, а знайсці яго ніяк не магла. Раззлавалася гаспадыня і пабегла да мужа.

— Нічога не варта твая трава мёга! Дарэмна я старалася, варыла яе. Гандляр пайшоў і нічога нам не пакінуў.

— Не можа быць! Хто паесць травы мёга, абавязкова што-небудзь забудзецца. Пашукай як след! Пэўна ён што-небудзь забыўся.

Гаспадыня зноў пабегла ў пакой, дзе начаваў гандляр, зноў усё агледзела, усё перавярнула дагары нагамі і зноў нічога не знайшла. Нарэшце яна спынілася пасярод пакоя і разгублена паглядзела па баках. Раптам яна пляснула сябе па лбе і на ўвесь дом закрычала:

— Забыўся! Забыўся!

Муж пачуў крык і прыбег да яе.

— Ну што? Што забыўся?

— Забыўся заплаціць за начлег!

ХВАЛЬКО ГАМБЭЙ

У адной вёсцы жыў селянін, якога звалі Гамбэй. Суседзі недалюблівалі Гамбэя: надта ж ён выхваляўся. Калі з кім-небудзь здаралася непрыемнасць, Гамбэй смяяўся і казаў:

— Са мной такога ніколі не будзе! Мяне так проста не ашукаеш!

Аднойчы Гамбэй сабраўся ў горад.

Ён вырашыў купіць на рынку цялушку. Жонка Гамбэя выбрала самую моцную вяроўку, падала яе мужу і сказала:

— Вядзі цялушку дадому на вяроўцы. Ды глядзі, каб па дарозе не ўкралі зладзеі.

— Што ты мелеш! — раззлаваўся Гамбэй.— Каб у мяне ды ўкралі цялушку! Не, мяне так проста не ашукаеш!

У той жа дзень пайшоў Гамбэй у горад. Доўга хадзіў ён па рынку і нарэшце ўбачыў адкормленую белую цялушку.

«Вось гэта якраз тое, што я шукаў! — узрадаваўся Гамбэй.— Ні ў кога ў нашай вёсцы няма такой цялушкі!» І ад радасці Гамбэй ажно зацмокаў языком.

Старгаваўся ён з прадаўцом і пагнаў цялушку дадому. На ўскраіне горада ўспомніў Гамбэй, што паблізу тут жыве яго стары знаёмы — шавец.

Зайшоў Гамбэй да сябра — адразу ж пачаў хваліцца:

— Паглядзі, якую я цялушку купіў! Такой цялушкі ў цябе ніколі ў жыцці не было!..

І ад радасці Гамбэй зноў зацмокаў языком.

А ў шаўца гэтага быў вучань — хлопчык Іціра. Іціра паглядзеў на цялушку, таксама пацмокаў языком і сказаў:

— Гэта праўда, цялушка добрая. Глядзіце

толькі, Гамбэй-сан[1], каб па дарозе яе не ўкралі.

Гамбэй засмяяўся:

— У цябе яе, вядома, укралі б, а мяне не ашукаеш! Не такі я чалавек!

Сказаў ён гэтак, развітаўся і пайшоў дадому.

Як толькі Гамбэй пайшоў, Іціра сказаў:

— Дазвольце мне, гаспадар, адвучыць гэтага чалавека ад самахвальства.

— Ад гэтай хваробы яго ніхто не вылечыць,— адказаў майстар.

— Прашу вас: дазвольце мне паспрабаваць.

— Як жа ты гэта зробіш?

— А я ўкраду ў яго цялушку.

— Паспрабуй, калі хочаш. Толькі нічога з гэтага не выйдзе: ён жа вядзе цялушку на вяроўцы.

— Паглядзім, паглядзім! — усклікнуў хлопчык і, схапіўшы са сцяны новую пару сандаляў, выбег на вуліцу.

Іціра ведаў дарогу, па якой ішоў Гамбэй. Па бакавых сцяжынках ён апярэдзіў хвалько, кінуў адну сандалю на дарогу, а сам схаваўся ў траве.

Задаволены Гамбэй цягнуў за сабой цялушку і мурлыкаў нейкую песеньку. Раптам ён убачыў на дарозе сандалю.

---

[1] Сан — прыстаўка, якую дадаюць да імя субяседніка, каб падкрэсліць сваю павагу да яго.

— Цэ, цэ, цэ! — засмуціўся хвалько.— Шкада, што няма другой. А дзеля адной і нагінацца не варта...

І, тузануўшы за вяроўку, ён павёў цялушку далей. Так прайшоў Гамбэй, можа, ры[1], а можа, і менш, але толькі ён увайшоў у лясок, як убачыў такую самую сандалю.

— Як шкада, што я не падняў першай сандалі,— засмуціўся Гамбэй.— А яна ж, мабыць, і цяпер валяецца на тым месцы.

Гамбэй хуценька прывязаў цялушку да дубка і кінуўся назад, туды, дзе ён убачыў першую сандалю. Сандаля ляжала на старым месцы.



[1] Ры — мера даўжыні, 3,9 кіламетра.

Гамбэй схапіў яе і заспяшаўся ў лясок. Але, калі ён падбег да дубка, цялушкі там не было.

Гамбэй абшукаў увесь лясок, але цялушка нібы скрозь зямлю правалілася.

«І як гэта яна адвязалася? — думаў Гамбэй.— Хаця б ніхто не даведаўся, што са мной здарылася такое...»

Не знайшоў ён цялушку і падаўся зноў у горад: нельга ж было вярнуцца да жонкі без цялушкі. Тады прыйшлося б ва ўсім прызнацца.

А Іціра тым часам прыгнаў украдзеную цялушку дадому і схаваў яе на двары. Хлопчык расказаў майстру, як ён перахітрыў хвалько Гамбэя, і абодва яны доўга смяяліся.

— Што ж мы будзем рабіць з гэтай цялушкай? — спытаў Іціра.

Гаспадар не паспеў нічога адказаць, бо ў гэты момант рассунуліся дзверы і ўвайшоў Гамбэй.

— А дзе ж твая цялушка, шаноўны Гамбэй-сан? — знарок абыякава спытаў майстар.

— Цялушка? Ах, цялушка! Ведаеш, яна мне нешта не спадабалася, я і прадаў яе прахожаму. Хачу цяпер купіць сабе другую. Таму і вярнуўся.

Гаспадар пачаставаў Гамбэя тытунём і сказаў:

— Табе пашанцавала: я даўно ўжо збіраўся прадаць сваю цялушку. Калі не будзеш скнарай,— можа, старгуемся.

І ён загадаў Іціра прывесці цялушку.

— Колькі ж ты хочаш за яе? — спытаў Гамбэй, калі хлопчык выканаў загад гаспадара.

— Ды столькі ж, колькі ты заплаціў за сваю.

— Яшчэ што скажаш! — замахаў на яго рукамі Гамбэй.— Хіба можна параўнаць маю цялушку з тваёю?! Мая была большая і тлусцейшая! Ды і поўсць на тваёй цялушцы куды карацейшая!

— Як сабе хочаш, танней я не прадам.

Давялося Гамбэю за сваю ж цялушку заплаціць зноў.

Калі ён вывеў яе з двара, майстар сказаў:

— Спадзяюся, Гамбэй-сан, што ніхто па дарозе не ўкрадзе тваю цялушку?

І зноў Гамбэй пачаў выхваляцца:

— Ну не, мяне не ашукаеш! Не такі я чалавек!

Як толькі Гамбэй пайшоў, Іціра зноў папрасіў:

— Дазвольце, пане гаспадар, я яшчэ раз украду гэтую цялушку.

— Ну, другі раз табе ўжо гэта не ўдасца! Цяпер яго так проста не ашукаеш.

— А ўсё-такі дазвольце мне паспрабаваць. Вельмі ж хочацца адвучыць яго ад самахвальства.

— Што ж, паспрабуй...

Іціра зноў пабег у лясок, каб апярэдзіць хвалько. Ён схаваўся ў кустах каля дарогі і пачаў чакаць. Як толькі Гамбэй паказаўся на сцежцы, хлопчык гучна замыкаў:

— Му-у-у, му-у-у...

— Ды гэта ж крычыць мая цялушка, што прапала! — узрадаваўся Гамбэй.— Зараз я злаўлю яе, і ў мяне будзе дзве цялушкі!

І, прывязаўшы патройным вузлом цялушку да дубка, Гамбэй кінуўся ў кусты, адкуль чулася мыканне.

Тады Іціра, не перастаючы мыкаць, пачаў перабягаць з месца на месца. Завабіўшы хвалько ў

самы гушчар, хлопчык прыбег да дубка, адвязаў цялушку і пагнаў яе дадому.

Ужо заходзіла сонца, калі Гамбэй нарэшце выбраўся на сцежку. Тут ён адразу ўбачыў, што і другая яго цялушка знікла.

Зноў Гамбэй падаўся ў горад.

Зайшоў ён у дом шаўца і моўчкі спыніўся каля дзвярэй.

— Што прывяло вас зноў у горад і дзе ваша цялушка?! — спытаў хітры Іціра.

— Ды бачыш,— пачаў хлусіць хвалько,— па дарозе я зайшоў у храм і падарыў цялушку настаяцелю, каб багі былі да мяне яшчэ больш міласцівыя. Раніцай пайду на рынак і куплю сабе зноў.

Гаспадар усміхнуўся і сказаў:

— Можаш не чакаць да раніцы. У мяне ёсць на продаж яшчэ адна добрая цялушка.

Ледзь стрымліваючы смех, Іціра прывёў белую цялушку. Каб не засмяяцца, гаспадар увесь час прыкрываў рот веерам.

Гамбэй убачыў цялушку і нездаволена прабурчаў:

— Гэтая цялушка ў сто разоў горшая за маю!

Тут ужо майстар і хлопчык не вытрымалі і пачалі рагатаць, ды так гучна, што збегліся суседзі. Усе пыталіся, што здарылася.

Тады гаспадар расказаў, як хвалько Гамбэй

два разы купіў адну і тую ж цялушку і прыйшоў па яе трэці раз.

Тут і суседзі пачалі весела смяяцца.

Калі смех крыху сціх, майстар сказаў:

— Гамбэй-сан, абяцай ніколі больш не хваліцца, і я аддам табе цялушку і грошы.

Прыйшлося Гамбэю згадзіцца: нельга ж вярнуцца з горада без грошай і без цялушкі. Забраў ён цялушку, папрасіў, каб далі таўсцейшую вяроўку, і паплёўся дадому.

Неўзабаве пра гэтую гісторыю даведаліся і ў яго вёсцы.

З таго часу, калі Гамбэй пачынаў выхваляцца, хто-небудзь гаварыў:

— Гамбэй-сан, раскажыце, як вы тры разы куплялі адну і тую ж цялушку.

Хвалько адразу змаўкаў і толькі збянтэжана абмахваўся веерам.

ЗМЕСТ

Медуза і малпа. *Пераклаў С. А. Міхальчук* — 3
Аднавокі і двухвокі. *Пераклаў С. А. Міхальчук* — 18
Гуз справа і гуз злева. *Пераклаў С. А. Міхальчук* — 23
Прагная гаспадыня* — 35
Хвалько Гамбэй — 38

* Пераклады казак «Прагная гаспадыня» і «Хвалько Гамбэй» узяты з кнігі: Японскія казкі.— Мн., 1959.

Литературно-художественное издание
МЕДУЗА И ОБЕЗЬЯНА
Японские сказки

Для детей дошкольного возраста

Минск, издательство «Юнацтва»
На белорусском языке

Літаратурна-мастацкае выданне
МЕДУЗА І МАЛПА
Японскія казкі

Загадчык рэдакцыі М. А. Казбярук. Рэдактар Н. І. Мірончык. Малодшы рэдактар Н. А. Грышкова. Мастацкі рэдактар А. У. Ружо. Тэхнічны рэдактар В. А. Каляда. Карэктар Л. І. Саўчанка.

ІБ № 1012

Здадзена ў набор 06.07.87. Падпісана да друку 08.02.88. Фармат 70×84¹/₁₆. Папера афс. № 2. Гарнітура Школьная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 3,27. Ум. фарб.-адб. 13,63. Ул.-выд. арк. 1,83. Тыраж 200 000 экз. Зак. 206. Цана 10 к.

Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінская фабрыка каляровага друку. 220115, Мінск, Каржанеўскага, 20.

Дыяпазітывы падрыхтаваны Мінскім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінатам МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

10к.